поўным адкрыццем толькі сення для савецкіх гісторыкаў дзякуючы работам вучняў выдатнага савецкага даследчыка-медэевіста А.І. Неўсыхіна – такіх, як А.Гурэвіч, Л.Мільская, Ю.Бясмертны і інш. А.І.Неўсыхін падтрымліваў у сваіх шматлікіх вучняў вернасць і адданасць навуковай ісціне, якая не залежыць ад кан'юнктурных абставін. Гэта ўсяляе пэўны аптымізм. Як адзначае А.Гурэвіч, задачы, якія паставіла "Новая гістарычная навука" патрабуюць сення вучонага новага тыпу, які адначасова валодаў грунтоўнай тэарэтычнай падрыхтоўкай і схільнасцю да пытанняў метадалогіі і эпістымалогіі.

Сення сусветная гістарычная навука перажывае пэўныя цяжкасці, якія звязаны з крызіснымі з'явамі сучаснасці, і перш за усе падрывам агульнай веры у ідэю прагрэса, які надаваў аптымізм навуцы XIX ст. Нападкам і абвінавачванням падвяргаюцца вядучыя гістарычныя школы, у тым ліку і школа "Аналаў". Тым не менш у працах паслядоўнікаў "Новая гістарычнай навукі" галоўным застаецца праблема глабальнай гісторыі і гістарычнага сінтэзу.

## КАМПЛЕКТАВАННЕ І ПРАПАГАНДА БЕЛАРУСКАЙ КНІГІ У МІНСКАЙ ГАРАДСКОЙ ЦБС

Т.П.Князява

Глыбокія перамены, праходзячыя у нашым грамадстве, патрабавалі новага падыходу і да работы бібліятэк. У іх праводзіцца цэленапраўленая работа па пераарыентацыі бібліятэчнага абслугоўвання з традыцыйных палітычных і ідэалагічных установак у бок развіцця гуманістычных функцый бібліятэк, станаўленню іх як цэнтраў дасуга, каб памагаць у болей разумным выкарыстанні свабоднага часу, эфектыўным адпачынку людзей, зрабіць бібліятэкі цэнтрамі узраджэння беларускай мовы, беларускай культуры.

Арыентацыя на развіцце гуманістычных, нацыянальных традыцый адбілася на фарміраванні кніжных фондаў Мінскай гарадской ЦБС. Калі на І.01.87 г. колькасць кніг на беларускай мове складала 8704 экз. (альбо 3,5%), кнігавыдача – І4І80 (альбо 4,І%), абарачальнасць – І,6, то на І.01.9І колькасць экзэмпляраў павысілася да



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ц556 (4,3%), кнігавыдача кніг на беларускай мове склала 19540 (альбо 6,3%), абарачальнасць склала 1,7. На 1.01.92 г. фонд дакументаў на беларускай мове павялічыўся на 10706 экз. У 1991 г. было праведзена анкетаванне чытачоў па пытаннях складу фонда у цэлым і на беларускай мове. Апытанныя рэспандэнты прапанавалі камплектаваць фонд творамі сучасных беларускіх аўтараў, творамі пісьменнікаў, рэпрасаваных у 20-30 гг., кніжкамі па гісторыі і культуры Беларусі, беларускаму фальклору. У бібліятэках вывучаецца выкарыстанне беларускай кнігі, аналізуюцца прычыны адмовы на яе. У 1991 г. сума грошай на камплектаванне беларускай кнігі павялічылася у 17 разоў.

Усе гэта не прайшло дарэмна, палепшылася прапаганда беларускай кнігі, яе выкарыстанне. Так увесь 1990 год прайшоў пад эгідай святкавання 500-годдзя беларускага першадрукара Ф.Скарыны. Ва усіх бібліятэках былі арганізаваны скарынінскія урокі, чытанні, святы беларускай кнігі, вечарыны, творчыя суустрэчы з рэжысерам фільма "Францыск Скарына".

Шырока адзначалася ва усіх бібліятэках сістэмы у 1991 г. 100-годдзе з дня нараджэння М.Багдановіча. Ішло прадстаўленне яго зборніка "Вянок", праводзіліся фальклорныя святы, літаратурныя кампазіцыі.

1992 г. быў знамянальны для усей культуры Беларусі. У гэтым годзе святкавалася 110-я гадавіна з дня нараджэння вядомых класікаў беларускай літаратуры Я.Купалы і Я.Коласа. Пастаянна дзеючая выстава "Нам засталася спадчына" (б-ка-філіял № 10), конкурсы на лепшага дэкламатара (б-ка-філіял № 7), вечарына "Твае песняры, Беларусь!" (б-ка-філіял № 18) і іншыя мерапрыемствы былі прысвечаны беларускім песнярам.

У 1992 годзе бібліятэкі прынялі удзел у конкурсе "Бібліятэка - асяроддзе нацыянальнай культуры", аб'яўленага беларускім фондам культуры. Аб узрастаючым інтарэсе да гісторыі культуры Беларусі сведчыць рост масавых мерапрыемстваў гісторыка-культурнай накіраванасці. Пра гэта гавораць іх назвы - "Гісторыя грамадства - у новым асвятленні", "Нам засталася спадчына", "Дыханне мінуўшчыны", "Каменны летапіс Беларусі" і інш.

Бібліятэкі супрацоўнічаюць з работнікамі музеяў, мастакамі, кампазітарамі, народнымі умельцамі, разам праводзілі работу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

па арганізацыі народных гульняў, свят, абрадаў. З вопытам арганізацыі правядзення народных святаў "Дзяды", "Каляды", "Гуканне вясны" пазнаемілі ЦБ Я.Купалы, б-ка № 3 імя Маякоўскага, № 14 "Юнацтва", № 15 імя Цёткі.

Але, разам з тым, сення патрэбна адзначыць, што дзяржаўная эканомія на развіцці культуры стварыла у некаторай частцы грамадзян дэфіцыт духоўнасці, абьякавасці да высокага мастацтва і прыгажосці, да культурнай спадчыны і духоўных каштоўнасцей. Усе гэта сказваецца на камплектаванні і выкарыстанні бібліятэчных фондаў. З-за фінансавых цяжкасцей няма магчымасці, каб паступленні літаратуры адпавядалі попыту. Рост цэн на выданні літаратуры выклікае зніжэнне экземплярнасці. Бібліятэкі не у поўным аб'еме атрымліваюць дакументы па папярэдніх заказах. Час патрабуе і лепшай прапаганды беларускай кнігі, каб гэта быў не выпадковы набор мерапрыемстваў, а прадуманая сістэма.

## УМЕЦЬ ПАЛЕМІЗАВАЦЬ

У.А.Фамін

Ва умовах палітычнага і духоўнага развязвалення, пашырэння дэмакратыі усе большае значэнне набывае палеміка. На вялікі жаль яна у нашым грамадстве нярэдка ператвараецца у звычайную сварку. Але ж сварка і палеміка не маюць нічога агульнага. Яны - антыподы. Першая - прыкмета невыхаванасці, нізкай культуры. Другая ж - рыса асобы высокай культуры.

Майстэрства палемізаваць не прыходзіць да чалавека з малаком маці, не даецца яму у спадчыну. Яму трэба вучыцца. Уменне весці дыялог - важнейшая састаўная частка красамоўства. Яшчэ Цыцэрон, адзначаючы вялікія магчымасці красамоўства для уздзейнічання на людзей, лічыў яго адным з галоўных сродкаў дзяржавы. Ен быў перакананы у тым, што любы грамадскі ці дзяржаўны дзеяч павінен валодаць майстэрствам публічнага слова.

Шкада, што гэтаму не вучаць у нас ні у школе, ні у вышэйшых навучальных установах. Між тым, яшчэ у старажытныя часы вуснаму слову надавалі вельмі вялікае значэнне. Напрыклад, у ста-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ